■ З нагоды

МАЦЯРЫНСКІ КАПІТАЛ

Жанчыны ахоўваюць ачаг не толькі сваёй сям'і, але і ўсёй дзяржавы

Тыдзень цішыні (без абортаў) у бальніцах, адзіны ўрок сямейнага жыцця ў школах, фінал конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава», II гарадскі форум маці ў сталіцы і 367 новых ордэнаў Маці. Гэтыя і іншыя мерапрыемствы прайшлі і яшчэ адбудуцца ў Беларусі з 9 па 15 кастрычніка, калі ў краіне традыцыйна святкуюць Дзень маці (само свята мы адзначым 14 кастрычніка).

Фота БЕЛТА.

Мацярынскі форум

Учора ў сталіцы прайшоў II гарадскі форум «Маці сталіцы: практыка малых і вялікіх спраў — важкі ўклад у развіццё горада». Упершыню ён адбыўся ў 2006-м, у Год маці. Сёлета больш за 450 мінчанак — яго ўдзельніц — наведалі сацыяльныя і прамысловыя ўстановы, пазнаёміліся з вопытам іх работы і абмеркавалі складаныя сацыяльныя пытанні.

— Форум — знакавае мерапрыемства не толькі для сталіцы, а і для ўсёй краіны. А ўсё, што датычыцца пытанняў сям'і, мацярынства, дзяцінства, актуальна як для нашай дзяржавы, так і для іншых краін. І важна, што яны разглядаюцца на сённяшнім пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД у Сочы, дзе будзе падпісана заява аб падтрымцы кіраўнікоў дзяржаў інстытута сям'і і традыцыйных каштоўнасцяў, — расказала **Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.** — Думаю, што з наступнага года гэтае мерапрыемства можна будзе пашыраць на межы ўсёй рэспублікі. Разам жанчыны — вялікая сіла, а маці — ахоўніца не толькі ачага сваёй сям'і, але і ўсёй дзяржавы.

Наталля Качанава выказала спадзяванне, што рэзалюцыі форуму будуць не толькі рэалізоўвацца на практыцы, але і стануць асновай для новых заканадаўчых ініцыятыў і дапамогуць умацаваць імідж Беларусі на міжнароднай арэне.

За адказную працу і бязмежную любоў да дзяцей падзякаваў усім жанчынам-маці **Ігар ЮРКЕВІЧ, намеснік старшыні Мінгарвыканкама**, які заўважыў, што «мацярынства — самы шчаслівы час, і самае лепшае, што можа падарыць жанчыне прырода».

Напрыканцы форуму ордэн Маці атрымалі 24 мінчанкі. Усяго ж з 1996 года пачэсная ўзнагарода была ўручана 643 жыхаркам сталіцы. Сёлета ў Беларусі былі прызнаны заслугі 376 шматдзетных маці.

Дэкрэт для таты

Сацыяльная падтрымка і клопат пра здароўе маці і дзяцей у краіне ўжо праяўляецца ў 11 відах дапамогі, мацярынскім капітале, бясплатным харчаванні для шматдзетных і сем'яў, дзе выхоўваецца дзіця-інвалід, і іншай дапамозе. Са снежня мясцовым распарадчым органам дадзена права пашыраць спектр сацыяльных паслуг у раёнах, зыходзячы з запатрабаванасці ў іх, а Міністэрства працы і сацыяльнай абароны распрацуе стандарт іх якасці. У праект закона аб Працоўным кодэксе ўнесены нормы, якія дазволяць татам пасля нараджэння дзіцяці браць 14-дзённы адпачынак па яго доглядзе, а мамам — мець гібкі графік працы і магчымасць працаваць дыстанцыйна, асабліва калі малому ўжо споўнілася тры гады.

У сталіцы 13 000 шматдзетных сем'яў. Штогод іх колькасць павялічваецца на 1000. Пры гэтым некаторыя сем'і рашыліся на нараджэнне 10, 11 і ажно 12 дзяцей.

— На больш як 552 тысячы дзяцей у краіне, ці кожнага трэцяга малога, бацькі атрымліваюць дапамогу, у межах праграмы мацярынскага капіталу адкрыта 43 193 дэпазіты на дзяцей на суму амаль 431,93 мільёна долараў. Гэтая мера, якая будзе рэалізоўвацца да канца 2019-га, спрацоўвае. Калі ў 2010 годзе ў нашых сем'ях нарадзілася трэцімі і наступнымі 12 251 дзіця, то ў 2016-м іх было ўжо 22 223. Шматдзетных сем'яў у нас цяпер больш як 92 тысячы, і яны ўсё часцей карыстаюцца сацыяльнымі паслугамі, у прыватнасці паслугай нянькі, — падкрэсліў **Аляксандр РУМАК, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны.** — Па дапамогу гэтых спецыялістаў летась звярнуліся 1980 сем'яў, а сёлета толькі за паўгода — ужо 1881 сям'я.

Новая рэдакцыя закона аб дзяржаўных дапамогах прадугледжвае ўмацаванне сацыяльнай падтрымкі, асабліва тым, хто атрымлівае мінімальную дапамогу, напрыклад, студэнткам, якія не паспелі папрацаваць да родаў. Ім выплачваюцца даплаты, каб давесці мінімальную велічыню дапамогі да памеру звычайнай дапамогі па доглядзе дзяцей да трох гадоў, а гэта — 35% ад сярэдняга заробку, нагадаў Аляксандр Румак.

Цэнтр здароўя мужчын

У клопаце пра маці і дзяцей спецыялісты ўсё часцей задумваюцца і пра якасць жыцця мужчын. У прыватнасці, апошнія тры гады разглядаецца праблема мужчынскага бясплоддзя. Іх фізіялогія мяняецца праз тэхнагеннасць нашага грамадства, і на дзве трэціх бясплодных жанчын прыходзіцца траціна такіх жа мужчын, кажуць спецыялісты і сцвярджаюць, што ў хуткім часе ў сталіцы з'явіцца цэнтр здароўя мужчын.

— Мы сутыкаемся таксама з тым, што жанчыны нараджаюць усё пазней. Першага малога нараджаюць у 24—25 гадоў, а другога — каля 30. Аднак з узростам з усё большымі праблемамі са здароўем прыходзяць жанчыны, — занепакоена сітуацыяй **Алена БОГДАН, начальнік упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы**. — Нельга нараджаць дзіця толькі тады, калі ты ўсё маеш. Нездарма ёсць прымаўка ў старых, што дзіця прыходзіць у свет са сваім хлебам.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

Міхаіл ЧАРАПЕННІКАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Беларусі: «Штогод беларусы ўсынаўляюць 500—600 дзетак, і амаль палова такіх сем'яў пры гэтым адмаўляецца ад тайны ўсынаўлення. Усё часцей усынаўляюць не толькі немаўлят, але і пяці-, сямі- і нават дзесяцігадовых дзетак. Ёсць бацькі, якія не спыняюцца на адным малым — сёлета за 9 месяцаў пяць сем'яў усынавілі ўжо другое і наступнае дзіця. Ёсць нават сем'і, якія праз усынаўленне дзетак сталі шматдзетнымі. Акрамя таго, чатыры з пяці дзетак-сірот выхоўваюцца ў замяшчальных сем'ях. І штогод амаль 200 сем'яў аднаўляюць свае бацькоўскія правы».

■ Фінансы

Насельніцтва здае валюту...

Беларусы ў верасні прадалі наяўнай валюты на 629,4 млн долараў. Купілі ж у абменніках усяго на суму да 407,5 млн долараў. Пры гэтым ужо дваццаць месяцаў нашы людзі застаюцца чыстымі прадаўцамі наяўнай валюты, паведамляецца ў матэрыялах Нацбанка Беларусі.

Такім чынам, у верасні чысты продаж наяўнай валюты склаў 221,9 млн долараў. Увогуле, статыстыка рэгулятара сведчыць аб тым, што з пачатку года насельніцтва прадало наяўнай і безнаяўнай валюты на 6,177 млрд долараў у эквіваленце, а набыла — 4,59 млрд долараў. Чысты продаж замежнай валюты фізічнымі асобамі склаў 1,587 млрд долараў.

З суб'ектамі гаспадарання сітуацыя з валютай крыху іншая. Прадпрыемствы ў верасні зноў сталі чыстымі пакупнікамі, прадаўшы 13,410 млрд долараў і купіўшы 13,841 млрд долараў.

Частка прададзенай грамадзянамі валюты — гэта назапашаныя дэпазіты. Па звестках Нацбанка, летась валютныя дэпазіты фізічных асоб скараціліся на 9,5%, ці амаль на 800 млн долараў.

Як адзначаюць эксперты, у насельніцтва пры зніжэнні ўзроўню даходаў захоўваецца звычка да спажывання, а ў выніку трацяцца зберажэнні. Пры гэтым летам абазначыліся станоўчыя тэндэнцыі ў заработнай плаце. У прыватнасці, сярэдні заробак расце ўжо пяць месяцаў запар. Між іншым за ўвесь мінулы год беларусы прадалі наяўнымі на чыстай аснове 2,441 млрд долараў у эквіваленце, паспрыяўшы прыкметнаму павелічэнню золатавалютных рэзерваў.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ «З базай» у галаве

ЁСЦЬ ІДЭЯ? ЗАЯВІ...

Міністэрства адукацыі Беларусі і кампанія МТС абвясцілі пра старт II Рэспубліканскага конкурсу маладзёжных праектаў «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу».

Прапанаваць свае ідэі могуць навучэнцы 8—11-х класаў і студэнты сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў ва ўзросце да 23 гадоў.

— Лічбавая трансфармацыя, якая ахапіла ўсе сферы грамадскага жыцця, ставіць нас перад неабходнасцю не проста прыстасоўвацца да змен, а быць актыўнымі ўдзельнікамі інавацыйных працэсаў. Наш конкурс дазваляе навучэнцам праявіць сябе з творчага боку і, што асабліва важна, спрыяе фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі маладых людзей, бо іх праекты могуць рэальна паўплываць на тое, што адбываецца ў сферы адукацыі, — пракаментаваў падзею **дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Павел ЛІС.**

Конкурс пройдзе ў тры этапы: збор праектаў і ацэнка журы, паўфінал і работа з ментарамі, фінал і абарона праектаў. Конкурсныя работы будуць ацэньвацца ў наступных намінацыях: «Найлепшы інавацыйны праект для навучэнцаў і студэнтаў ВНУ»; «Найлепшы інавацыйны праект для бацькоў»; «Найлепшы інавацыйны праект для педагогаў» і «Найлепшы маладзёжны інавацыйны праект».

Прыём праектаў на конкурс прадоўжыцца да 16 лістапада. Прапановы і ідэі, афармленыя ў прэзентацыі, можна размясціць на сайце конкурсу yip.unibel.by або адправіць па электроннай пошце на адрас yip@unibel.by.

Па словах кіраўніка камерцыйнага дэпартамента МТС Мікалая БУЛАША, у 2016 годзе ў конкурсе прынялі ўдзел 200 чалавек, экспертная група разгледзела і ацаніла больш за 50 праектаў, 13 з якіх прайшлі ў фінал: «Гэтым разам мы чакаем не меншую колькасць работ. Падобная адукацыйная ініцыятыва — добры прыклад прыватна-дзяржаўнага партнёрства, у выніку якога кампанія МТС і Міністэрства адукацыі інвестуюць у будучыню».

Конкурс праводзіцца ў рамках пагаднення, заключанага паміж мабільным аператарам і міністэрствам. Партнёрам выступае кампанія Huawei. Аўтары найлепшых праектаў не толькі змогуць увасобіць свае ідэі ў жыццё, але і атрымаюць каштоўныя падарункі.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

Шматдзетных маці бясплатна пракансультуюць

13 кастрычніка Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь пры ўдзеле Рэспубліканскай калегіі адвакатаў і Беларускай натарыяльнай палаты правядзе бясплатнае юрыдычнае кансультаванне шматдзетных маці, прымеркаванае да правядзення Тыдня маці.

У гэты дзень на «пляцоўцы» Міністэрства юстыцыі шматдзетныя маці змогуць атрымаць бясплатныя юрыдычныя кансультацыі па розных прававых пытаннях, звязаных са спагнаннем аліментаў, прымусовым выкананнем судовых пастаноў і іншых выканаўчых дакументаў, дзейнасцю натарыусаў і работнікаў органаў загса, адвакатаў, якія ажыццяўляюць юрыдычныя паслугі, а таксама па іншых пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі органаў юстыцыі.

Кансультацыю можна будзе атрымаць з 10 да 13 гадзін па адрасе: г. Мінск, вул. Калектарная, 10, 3-і паверх, каб. 321 (зала пасяджэнняў).

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

■ Футбол

Зборныя завяршылі сезон

Маладзёжка абыграла малдаван, а нацыянальная каманда саступіла французам

У заключным матчы адборачнага турніру чэмпіянату свету — 2018 у Парыжы нашы футбалісты саступілі зборнай Францыі з лікам 1:2. Адзіны мяч у вароты гаспадароў забіў Антон Сарока, галявыя ўдары французаў на рахунку Антуана Грызмана і Аліўе Жыру.

— У сярэдзіне тайма аселі і прапусцілі два мячы, прычым другі не зусім абавязковы. Малайцы, што дастаткова хутка вярнуліся ў гульню, забілі мяч, які надаў нам упэўненасці і дадаў матывацыйны імпульс. У другім тайме згулялі больш упэўнена і надзейна, практычна не даўшы саперніку нічога стварыць, — пракаментаваў сустрэчу **галоўны трэнер беларусаў Ігар КРЫВУШЭНКА**. — *Думаю, на чэмпіянаце свету Францыя будзе адным з фаварытаў. Што датычыцца маёй будучыні ў зборнай, пакуль запланаваны дзве таварыскія гульні на лістапад. Магчыма, пасля іх штосьці стане ясна.*

Фота Сіньхуа – БЕЛТА.

Такім чынам, Францыя выходзіць на чэмпіянат свету ў Расіі з першага месца ў групе А, другое месца заняла зборная Швецыі, якая ў Амстэрдаме саступіла галандцам 0:2, але абышла іх у турнірнай табліцы па лепшай розніцы забітых і прапушчаных мячоў. Далей ідуць Балгарыя і Люксембург, замыкае табліцу з пяццю ачкамі зборная Беларусі.

Ужо сталі вядомыя 19 з 32 удзельнікаў чэмпіянату свету — 2018: Францыя, Партугалія, Расія, Бразілія, Іран, Японія, Мексіка, Бельгія, Карэя, Сірыя, Германія, Англія, Іспанія, Нігерыя, Коста-Рыка, Польшча, Егіпет, Ісландыя і Сербія.

Нагадаем, чэмпіянат свету пройдзе з 14 чэрвеня па 15 ліпеня на 12 стадыёнах у 11 гарадах Расіі.

Тым часам футбалісты маладзёжнай зборнай Беларусі (U-21) завяршылі толькі першую частку адборачнага турніру чэмпіянату Еўропы — 2019. У Барысаве яны прымалі каманду Малдовы і атрымалі перамогу — 3:1. Такім чынам падапечныя Людаса Румбуціса на гэты момант размясціліся на трэцім месцы ў сваёй адборачнай групе, наперадзе футбалісты Харватыі і Грэцыі.

Юніёрская зборная Беларусі (U-19) у польскім Хожуве ў заключным матчы першага кваліфікацыйнага раўнда кантынентальнага першынства разышлася мірам з аднагодкамі з Паўночнай Ірландыі — 0:0. Выніковае становішча камандаў: Германія — 9 ачкоў, Польшча — 6, Паўночная Ірландыя — 1, Беларусь — 1. Каманды Германіі і Польшчы выйшлі ў наступны этап адборачнага турніру.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by